***Беларускі Інстытут праблем культуры (БелДзІПК)***

Лабараторыя традыцыйнага мастацтва Беларускага ін стытута праблем культуры (1992–2009). Распрацоўваліся пытанні вывучэння, захавання, пераемнасці, папулярызацыі традыцыйнай спадчыны Беларусі. З 1993 ажыццяўлялася праграма комплекснага навукова-практычнага даследавання гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» (навуковы кіраўнік Т. Варфаламеева)

Вялікім дасягненнем працы калектыву даследчыкаў стала серыя рэгіянальных анталогій: «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў».

Любая этнічная культура па сваёй прыродзе дыялектная, г.зн. прадстаўлена ў той ці іншы перыяд часу шэрагам лакальных варыянтаў або культурных дыялектаў. У сувязі з гэтым безумоўную цікавасць для рэгіянальных і арэалагічных даследаванняў прадстаўляюць выданні, якія комплексна паказваюць этнічную культуру рэгіёна ў разнастайнасці яго лакальных традыцый. Праблема ідэнтычнасці індывідуума вырашаецца ў сферы лакальнай культуры, з традыцыямі і глыбіннымі сэнсамі якой ён сябе атаясамлівае. Лакальная культура "малой бацькаўшчыны" транслірue сэнсы, нормы маральных імператываў, паводзінаў і узаемадачыненняў з прыродным асяроддзем, эстэтычныя крытэрыі, якія традыцыйна склаліся ў лакальнай супольнасці на падставе яе паўсядзёнага, сакральнага і гістарычнага вопыту.

Адным з такіх выданняў з’яўляецца серыя “Традыцыйная мастацкая культура беларусаў”, прысвечаная комплекснаму паказу аўтэнтычных форм асноўных відаў і жанраў народнай культуры ўсіх шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Кожнаму з іх прысвечаны асобны том. Усяго серыя змяшчае 6 тамоў у 10 кнігах. Пачынаючы з 4-га тома, кожная кніга суправаджаецца гукавымі электроннымі дадаткамі (CD-ROM), у якіх прадстаўленыя народные спевы і народная проза ў выкананні вясковых выканаўцаў (запісы, зробленыя пераважна падчас экспедыцый). Раздзелы, прысвечаныя каляндарнай абраднасці, рыхтавалі В.І. Басько, Т.І. Кухаронак, Т.В. Валодзіна, А.М. Боганева.

***Варфаламеева*** *Тамара*

***Басько*** *Вольга*

Выбранае:

Басько В. І. Каляндарныя святочна-абрадавыя традыцыі і духоўнае выхаванне дзяцей і падлеткаў / Вольга Басько // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, УА "Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры". – Мінск. – 2008. – Вып. 3. – С. 90–97.

Басько В.І. Святочна-абрадавыя традыцыі: механізмы ўзнаўлення, захавання і трансляцыі / В. І. Басько // Веснік Інстытута культуры Беларусі : навукова-практычны часопіс / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – 2012. – Пілотны выпуск. – С. 93–95.

***Боганева*** *Алена*

***Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі***

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі – вышэйшая музычна-педагагічная навучальная ўстанова і навуковы цэнтр музыказнаўства, фалькларыстыкі, эстэтыкі, музычнай педагогікі ў г. Мінску. Заснавана ў 1932 годзе, да 1992 г. – Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага.

У 2000 годзе Беларускай Акадэміі музыкі быў прысвоены статус вядучага ВНУ нацыянальнай сістэмы адукацыі ў вобласці музычнага мастацтва.

Этнамузыколагі БДАМ актыўна даследуюць музычныя аспекты каляндарнай святочнасці.

***Бярковіч*** *Таццяна Леанідаўна* (н. 21.1.1970, г. Вілейка), этнамузыколаг. Кандыдат мастацтвазнаўства (1999). З 2003 загадчык кабінета нар. музыкі. Узначальвае работу па сістэматызацыі матэрыялаў фонаархіва этнамузыкі БДАМ, стварэнні фонду экспедыцыйна-палявых фоназапісаў, камп’ютэрнай базы даных. Распрацоўвае пытанні фенаменалогіі рытуальна-гульнявых форм бел. каляндарна-песеннага меласу, механізмы мелатворчых працэсаў у абрадава-гульнявых формах фальклору. Даследуе фарміраванне меладычных тыпаў, замацаваных за рытуальна значнымі гульнямі салярнага цыкла («Барана», «Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Ваджэнне «казы»).

Выбранае:

Бярковіч Т. «Яшчар» як песенна-гульнявая дзея зімовага перыяду / Т. Бярковіч // Беларускі музычны фальклор у даследаваніiях маладых этнамузыколагаў. Мн., 1996. Вып. 2;

Бярковіч Т. Напевы “Ваджэння Казы» і «Жаніцьбы Цярэшкі» ў аспекце гетэратопіі абрадава-гульнявой песеннай прасторы / Т. Бярковіч // Беларуская музыка: Гісторыя і традыцыі. Мн., 2003.

Бярковіч Т. Песенна-гульнявыя дзеі перыяду сонцавароту ў этнамузычнай традыцыі беларусаў: з аўдыядадаткам "Барана. Ваджэнне Казы. Жаніцьба Цярэшкі. Яшчар" / Таццяна Бярковіч. – Мінск : Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2015. – 169 с.

***Канстанцінава*** *Таццяна Леанідаўна*

Выбранае:

Валачобныя музычна-абрадавыя традыцыі беларусаў [Электронны рэсурс] / склад. Т. Канстанцінава. – Мінск : Беларус. дзярж. акадэмія музыкі, 2018. – 2 электрон. апт. дыска (CD-ROM): гуч., брашура (39 с.). – (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі : вып. 10).

Канстанцінава, Т. Катэгорыя "абход" у вывучэнні абрадавых песенных практык беларусаў / Т. Канстанцінава // Музычная культура Беларусі і свету: да 100-годдзя Л.С. Мухарынскай / склад. Т.С. Якіменка; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі: Вып. 12. Серыя 1, Беларуская музычная культура. – Мінск: УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", 2006. – С. 67–76.

Канстанцінава, Т. Л. Калядныя напевы Бярэзінска-Сожска-Заходнедзвінскага міжрэчча // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 28 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і

літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2020. – С. 157–163.

***Прыбылова*** *Васіліна Міхайлаўна*

Выбранае:

Прыбылова, В. Тыпалагізацыя музычных форм масленічнага абрадавага масіву ў перспектыве комплекснага вывучэння каляндарна-песеннай культуры верхняга цячэння Дняпра / В. Прыбылова // // Этнапесенная традыцыя Беларусі ў даследаваннях маладых музыказнаўцаў / склад. Т.С.Якіменка; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Вып. 11. Серыя 2, Пытанні этнамузыкалогіі. Мінск: УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", 2006. С. 29–34.

Прыбылова, В. Чашніцка-аршанска-мсціслаўскі арэал абрадавых напеваў Масленіцы: да пытання межавання песенных традыцый верхняга цячэння Дняпра / В. Прыбылова // Музычная культура Беларусі і свету: да 100-годдзя Л.С. Мухарынскай / склад. Т.С. Якіменка; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі: Вып. 12. Серыя 1, Беларуская музычная культура. – Мінск: УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", 2006. – С. 76–91.

***Даніловіч*** *Настасся*

Выбранае:

Даніловіч, Н. "Песенны каляндар" выганаўскай часткі заходнепалеска-панямонскага памежжа / Н. Даніловіч // Музычная культура Беларусі і свету ў разнастайнасці гукавых ландшафтаў / склад. Т.Л. Бярковіч; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Вып. 37. – Мінск: УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", 2016. – С. 3–16.

Даніловіч, Н. І. Абрадавыя песенныя практыкі веснавога перыяду на заходнепалеска-панямонскім памежжы / Н. І. Даніловіч // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Навукова-тэарэтычны часопіс. – 2019. – №34. – С. 39–50.

Даніловіч, Н. "Песенны каляндар" выганаўскай часткі заходнепалеска-панямонскага памежжа / Н. Даніловіч // Музычная культура Беларусі і свету ў разнастайнасці гукавых ландшафтаў / склад. Т.Л. Бярковіч; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Вып. 37. – Мінск: УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", 2016. – С. 3–16.

Каляндарна-песенныя традыцыі заходнепалеска-панямонскага памежжа [Электронны рэсурс] / склад. Н. Даніловіч. – Электрон. дан. (106′41″ гуч.). – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2015. – 2 электрон. апт. дыскі [CD-ROM]: гуч., брашура (32 с.)

Сярод значных прац па тэме іншых супрацоўнікаў:

Шпакоўская, Л. Напевы тыпу "страла" ў веснавым песенным цыкле паўднева-ўсходняй Беларусі // Гукасвет этнапесенный культуры беларусаў у даследаваннях маладых музыказнаўцаў: музычная міфапаэтыка, артыкуляцыя, тыпалогія, мелагеаграфія / складанне і навук. рэдакцыя Т.С. Якіменка, Т.Л. Бярковіч; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Вып. 30. Серыя 2: Пытанні этнамузыкалогіі. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2013. – С. 137–164.

Клименко, И.В. Весенне-троицкий напев Пинщины (к проблеме моделирования и внутривидового картографирования раннетрадиционных мелоформ) / И.В. Клименко // Музычная культура Беларусі і свету ў навуковым асэнсаванні / склад. В.У. Дадзіёмава; Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Вып. 31. Серыя 1: Беларуская музычная культура. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2014. – С. 284–302.